**УДК 811.161.3'373.2:398.92**

**В. А. Ляшчынская**

# ТУМАН ЯК ВІД ВАДЫ-РЭЧЫВА Ў ФРАЗЕАЛАГІЧНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ

Лящинська О. А. Туман як вид води-речовини у фразеологічній картині світу білорусів.

У статті досліджено фразеологізми з компонентом *туман*, зафіксовані в літературних і діалектних фразеологічних джерелах білоруської мови, виявлено характерну їм культурну конотацію, переданий і збережений стійкий ціннісний зміст культури білорусів як її творців і носіїв, з'ясовано категорії і смисли, пов'язані з *туманом* як найменуванням виду води-речовини. Установлено взаємодію мови і культури народу за допомогою фразеологізмів, що репрезентують концепт «*вода*» як фрагмент фразеологічної картини світу білорусів у діапазоні культурно-національної самосвідомості й об'єктивують здебільшого природний і просторовий коди культури.

Акцентовано на тому, що фразеологічні одиниці з компонентом *туман* і похідним від нього *туманити* передають найчастіше негативну конотацію відображених у них спеціальних дій, способів і засобів обдурювання, вихваляння, уведення людей в оману, небажання або неспроможність сприймати реальність такою, якою вона є, спотворювання інформації про життя або навіть підфарбовування її в рожевий колір. І все це пов'язане з компонентом-лексемою *туман*, за якою закріплена різноманітна символіка – неясність, неточність, розпливчатість, брехня, химера і т. ін.

*Ключові слова*: фразеологізм, компонент, туман, культурна інформація, символ, еталон, стереотип.


© В. А. Ляшчынская, 2017.

Лещинская О. А. Туман как вид воды-вещества во фразеологической картине мира белорусов.

В статье на материале фразеологизмов с компонентом *туман*, зафиксированных в литературных и диалектных фразеологических источниках белорусского языка, выявляется характерная им культурная коннотация, переданное и сохраненное устойчивое ценностное содержание культуры белорусов как их создателей и носителей, ее категорий и смыслов, связанных с *туманом* как наименованием вида воды-вещества. Устанавливается взаимодействие языка и культуры народа посредством фразеологизмов, частично репрезентирующих концепт *«вода»* как фрагмент фразеологической картины мира белорусов в диапазоне культурно-национального самосознания и объективирующих в основном природный и пространственный коды культуры.

Акцентируется внимание на том, что фразеологические единицы с компонентом *туман* и производным от него *туманить* передают наиболее часто негативную коннотацию отраженных в них специальных действий, способов и средств обманывания, надувательства, бахвальства, введения людей в заблуждение, нежелания или невозможности воспринимать реальность какой она есть, правдивость информации о жизни либо даже подкрашивания ее в розовый цвет. И все это связано с отбором компонента-лексемы *туман*, за которой закреплена разнообразная символика – неясность, неточность, расплывчивость, ложь, химера и под.

*Ключевые слова*: фразеологизм, компонент, туман, культурная информация, символ, эталон, стереотип.

Leshchinskaya O. A. Fog as a kind of water-substancein Belarusian phraseological world-view.

Based on the material of Belarusian phraseological units with the component *туман 'fog'*, listed in literary and dialectal phraseological sources, the article singles out their characteristic cultural connotation and the stable evaluative contents of Belarusian culture that they hand down and preserve, its categories and senses, connected with fog as the name for water as a kind of substance. The author identifies the interaction between the language and national culture through phraseological units, which partially represent the concept "water" as one of the components of phraseological world view of the Belarusians in the diapason of cultural and national self-awareness, objectifying generally the natural and spatial codes of the culture.

The authors points out that the phraseological units with the component *туман* (*fog)* and its derivative *туманить* most often convey a negative connotation: they reflect some special activities, ways and means for deceiving and conning people, showing off, misleading, inability or unwillingness to see the real world as it is, or maybe living in fool's paradise. This all is related to the selection of the component-lexeme *туман* (*fog)* that has certain symbolic meanings assigned to it – ambiguity, inaccuracy, lies or chimeras, etc. Linguistic and cultural analysis of phraseological units with the component *туман* (*fog)* is carried out with the aim to determine the cultural information that has been recorded in them and handed down to new generations, the moral and ethical norms and codes of conduct, people's relations that the Belarusians either consider to be laudable or reject and condemn. The subject of the research is the peculiarities of arrangement and ways of conveying cultural information, the contents of the "language" of culture based on the notion of fog with the aim of reconstructing the concept

© В. А. Ляшчынская, 2017.

"water", the integrity of which is impossible without taking into consideration all the "water" components in phraseological units that objectify the concept "water". One of these components is the lexeme *туман (fog),* which is a part of the thematic group "kinds of water".

*Key words:* phraseologicalunit, component, fog, image, natural code of the culture, symbol, reference sample, stereotype.

Агульнавядома, што вада – гэта адна з важнейшых прыродных стыхій з яе разбуральнай сілай і негатыўнымі дзеяннямі. Вядома і тое, што вада – самае пашыранае рэчыва ў прыродзе, якое было і застаецца адным з самых актуальных у жыцці чалавека. Вада як складнік зямной прасторы займае 361 млн. км$^2$, ці 70,8 % ад усёй плошчы і прадстаўлена рознымі вадаёмамі, ландшафтнымі аб'ектамі. Вада даруецца небам і выпадае ў выглядзе дажджу, граду, снегу. Вада здольна пераўтварацца ў пару, туман, расу. Вось чаму зусім не здзіўляе тое, што вада-стыхія і вада-рэчыва ўваходзіць у кола фундаментальных стыхій нашай планеты і займае адно з царскіх месцаў у філасофіі ўспрымання і асэнсавання гэтага прыроднага рэчыва (параўн. *Агонь – цар, вада – царыца*).

Несумненна і тое, што такія звычныя паняцці, як вада альбо мора, рака, балота, крыніца, завадзь, лужа, лужына, бераг, рэчышча, цячэнне, дождж, лёд, пара, раса, снег, туман, што так ці інакш звязаны з вадой, у свядомасці чалавека валодаюць значным пазнавальным патэнцыялам, сэнс гэтых паняццяў складваўся стагоддзямі ў ходзе назірання чалавекам за вадой і яе разнавіднасцямі, якасцямі, у выніку ўзаемадзеяння з гэтымі рэчывамі, аб'ектамі з вадой і інш. Менавіта зыходзячы толькі з уліку выключнай важнасці ў жыцці чалавека вады ўвогуле і ўсяго, што звязана з ёю, гэта не магло застацца бясследным у фразеалогіі, якая ў сваіх другасных адзінках як «згорнутых тэкстах» прызвана да кадзіравання ведаў, да выражэння кожным народам свайго практычнага і духоўнага вопыту, але толькі, па-першае, самага важнага ў жыцці чалавека, у адрозненне ад лексікі, якая сваімі адзінкамі абазначае ўсё; па-другое, да выражэння не толькі ведаў чалавека пра свет і сябе ў свеце, але і перадачы той ацэнкі і характарыстыкі ўсяго таго, што адлюстравана і завуалявана ў гэтых адзінках. А іх роля ў гісторыі мовы, жыцці кожнага народа – трансляцыя новым пакаленням носьбітаў мовы своеасабліва сфармуляваных правілаў і антыправілаў, установак, ці той культурнай інфармацыі, авалодванне якой і служыць далучэннем ці злучэнню такім чынам пакаленняў у адзіны народ.

Аб'ектам увагі ў межах прапанаванага артыкула абраны фразеалагічныя адзінкі з кампанентам *туман*, што ў свабодным

 © В. А. Ляшчынская, 2017.

выкарыстанні з'яўляецца найменнем аднаго з розных відаў вады, ці таго пераўтварэння, якім характарызуецца вада як атмасферная з'ява. Фразеалагізмы з гэтым кампанентам не былі прадметам даследавання ў беларускай фразеалогіі, а цікавасць да іх несумненная, паколькі гэтая група фразеалагічных адзінак складае частку канцэпту «*вада*» як аднаго з важных фрагментаў фразеалагічнай карціны свету беларусаў, рэканструяванне якога патрабуе цэласнасці, што можа быць дасягнута толькі з улікам усіх «водных» кампанентаў гэтых другасных адзінак у беларускай фразеалогіі (раней ужо былі прааналізаваны фразеалагізмы з кампанентам *вада* як самага частотнага [2; 3] і з кампанентам-найменнем ландшафтна-водных аб'ектаў [4]).

Прадметам нашага аналізу сталі асаблівасці афармлення і перадачы зместу паняцця *туман* у фразеалагічным фондзе беларускай мовы. Крыніцай збору фактычнага матэрыялу паслужылі слоўнікі фразеалагізмаў беларускай літаратурнай і дыялектнай мовы (гл. *Спіс крыніц* і іх умоўныя абазначэнні).

Мэта артыкула – выявіць, з аднаго боку, фразеалагізмы з названым кампанентам, з другога боку, устанавіць частотнасць лексемы-кампанента як своеасаблівага адбору пры стварэнні фразеалагізмаў з ліку адзінак мовы з такой тэматычнай прыналежнасцю кампанентаў-складнікаў фразеалагізмаў як рэпрэзентантаў канцэпту «вада», што ў дафразеалагічным існаванні былі ўжо «надзелены пэўным культурным сэнсам, выступалі са сваім сімвалічным зместам» [5, с. 26]. Галоўная задача даследавання – прааналізаваць вобразы фразеалагізмаў з адабраным кампанентам пры іх утварэнні, паколькі менавіта вобраз «становіцца тым своеасаблівым правадніком культуры, дзякуючы якому ажыццяўляецца ўзаемапранікненне дзвюх семіятычных сістэм – культуры і мовы» [1, с. 280], і ўстанавіць тую культурную інфармацыю фразеалагізмаў з кампанентам-найменнем аднаго з відаў вады, што яны экспліцытна ці імпліцытна ўтрымліваюць.

Частотнасць выкарыстання названага кампанента ў складзе фразеалагізмаў увогуле невысокая: лексема-кампанент *туман* адзначаецца толькі ў 10 адзінках. І ўсе фразеалагізмы з лексемай *туман* празрыстыя па сваёй матывацыі, паколькі абавязаны пры стварэнні іх вобразаў і ўспрыманню як новых другасных адзінак мовы найперш значэнню гэтай лексемы: 'згушчэнне драбнейшых кропелек вады або ледзяных крышталікаў у прыземных слаях атмасферы, што

© В. А. Ляшчынская, 2017.

робіць паветра непразрыстым’ [6, с. 548], і што не менш важна, асэнсаванню гэтага паняцця, абазначанага абранай лексемай. І гэта абумоўлена тым, што лексема *туман* яшчэ ў дафразеалагічны перыяд існавання была надзелена сімвалічным значэннем і несла ў дадатак да прыродных уласцівасцей гэтай сутнасці функцыянальна значныя для культуры сэнсы, што і надаюць гэтай сутнасці, у прыватнасці, туману як віду праяўлення вады, як атмасфернай з’яве, ролю знака «мовы» культуры: *туман* метанімічна прыпадабняецца няяснасці, недакладнасці, незразумеласці. Лексема *туман* набывае ролю наймення сімвалаў, уваходзіць у культурнае інфармацыйнае поле, пры стварэнні фразеалагізмаў выступае асновай метафары «туман».

Сапраўды, для ўсіх фразеалагізмаў з кампанентам *туман* характэрна скарыстанне агульнай метафары «*туман*», якая ўжываецца для апісання розных з’яў на аснове семантычных прыкмет, што ўласцівы і прыпісаныя чалавекам туману і могуць паводле пэўнай сваёй якасці ці ўласцівасці прыпадабняцца. А вобразы ўсіх фразеалагізмаў з гэтым кампанентам узыходзяць да старажытнага архетыповага ўсведамлення свету як супрацьпастаўленне «вядомае – невядомае» і «яўнае – скрытае».

Так, праз усведамленне туману як наймення і абазначэння сімвала непразрыстасці, нябачнасці, неразбярыхі ўтвораны фразеалагізмы *напускаць туману* ‘ўносіць няяснасць, няпэўнасць у якую-н. справу, заблытваць каго-н.’ (Л-2008-2: 85) ці дыялектныя варыянты *туману напускаць / падпускаць* ‘знарок заблытваць справу’ (Ю-1977: 116) і *туманы пускаць / напусціць* 1) ‘штосьці здалося, паказалася чалавеку ў яго ўяўленні (неверагоднае, нерэальнае)’; 2) ‘задурыць галаву, адурманіць’ (М-К-1972: 262). Фразеалагізмы праз дзеяслоўныя кампаненты суадносяцца з антропна-дзейнасным (становіцца вядомым, што дзеянне выконвае чалавек), а праз кампанент *туман / туманы* – з прыродна-ландшафтным кодамі культуры.

У аснову вобраза фразеалагізма пакладзена метафара, паводле якой унясенне няяснасці ці заблытванне справы кім-небудзь адносна другой ці другіх асоб прыпадабняецца да напускання туману. Маецца на ўвазе, што ў выніку такога дзеяння, як напусканне туману, адным чалавекам лёгка заблытаць, адурманіць другога ці другіх, не даць магчымасці гэтым людзям разабрацца. Пры напусканні туману маюцца ўмовы адурманіць каго-небудзь, ці, як адносна першага значэння фразеалагізма *туманы пускаць / напусціць*, чалавек у тумане не можа рэальна ўспрыняць, дакладна ацаніць сітуацыю, справу.


© В. А. Ляшчынская, 2017.

Фразеалагізмы перадаюць стэрэатыпнае ўяўленне чалавека пра спецыяльнае заблытванне, адурманьванне каго-небудзь, пра магчымасць знарок створанай няяснасці ў якой-небудзь справе і выступаюць своеасаблівым антыправілам, тым папярэджаннем, што такія дзеянні, такія намеры ў адносінах паміж людзьмі негатыўныя, не адпавядаюць нормам і ўстаноўкам.

Вытворным ад дзеяслоўнага фразеалагізма ў выніку дзеяння ўнутрыфразеалагічнага спосабу з'яўляецца назоўнікавы фразеалагізм *пусканне туману* 'стварэнне падманлівага ўражання пра сябе з выхвальваннем і паказам чаго-н. з лепшага боку' (Л-2008-2: 274) як стэрэатып падману, пахвальбы тым, што на самой справе зусім не так.

Выражэнне і характарыстыка такой семантычнай прыкметы метафары «*туман*», што прыпісана найменню гэтай атмасфернай з'явы, як невыразнасць, цьмянасць, знайшло і пры ўтварэнні фразеалагізма *туман у вачах / галаве* 'пра адсутнасць жадання зразумець відавочнае' (Ю-1977: 116). Фразеалагізм суадносіцца з прыродна-ландшафтным (праз кампанент *туман*), прасторавым (праз спалучэнне *у вачах / галаве*) і саматычным (праз варыянтныя кампаненты *вачах / галаве*) кодамі культуры, адбор кожнага з якіх, як і структуры іх, абгрунтаваны, прайшоў папярэдні культурны адбор.

Вобраз фразеалагізма створаны на аснове метафары, паводле якой немагчымасць ці нежаданне разумець ці ўспрымаць відавочнае, яўнае прыпадабняецца да наяўнасці туману ў вачах. Маецца на ўвазе, што чалавек не ўспрымае тое, пра што яму даводзяць, не хоча зразумець відавочнае, паколькі не хоча бачыць, а прычына гэтага – туман у вачах. А нежаданне бачыць, заўважаць што-небудзь успрымаецца як парушэнне культурнай устаноўкі, у адпаведнасці з якой вочы – орган зроку, успрымання, асэнсавання і разумення. Скарыстанне варыянтных кампанентаў месцазнаходжання туману – *у вачах / галаве* – сведчанне замацаванай сімволікі за гэтымі кампанентамі-саматызмамі, у прыватнасці, *вочы* выступаць сімвалам адной з найбольш важных каштоўнасцей у жыцці чалавека, а за кампанентам *галава* замацавана падобная і цесна звязаная другая каштоўнасць – 'розум, разуменне, успрыманне і асэнсаванне'. Але калі ў вачах ці ў галаве туман (адсутнасць добра бачыць ці зразумець, успрыняць і асэнсаваць відавочнае, яўнае), то гэта паказчык немагчымасці, з аднаго боку, самому ўспрымаць, асабліва калі пры гэтым няма цікавасці і жадання зразумець відавочнае, з другога боку, нешта ўталкаваць такому. Гэта

© В. А. Ляшчынская, 2017. 

асабліва выразна ілюструюць нават асобныя прыклады ўжывання дыялектнага фразеалагізма: *У яго ўсігда* ***туман у вычах****, дурiся, дурiся і ні ўталкуеш нічога. Што ты аб'ісьняіш, калі ў іх* ***туман у гылаве*** (Ю-1977: 116). Як вынік, фразеалагізм *туман у вачах / галаве* набывае ролю эталона вызначэння адсутнасці жадання штосьці зразумець, успрыняць як рэальнасць, праўдзівасць і пад.

Для адметнага ад папярэдняга наймення і характарыстыкі адной з асаблівасцей фізічнага стану ці разумовых здольнасцей чалавека скарыстана параўнанне *як у тумане*, якое набыло прыкметы фразеалагізма і вызначаецца двума значэннямі: 1) ‘не зусім выразна, цьмяна (помніць, бачыць і пад.’; 2) ‘у стане глыбокай задуменнасці’ (быць, жыць, хадзіць і пад.) (Л-2008-2: 537). Фразеалагізм праз спалучэнне прыназоўніка *у* з назоўнікам *тумане* ў форме М. скл. суадносіцца ў дадатак да прыроднага яшчэ і з прасторавым кодам культуры, тым самым указваючы на пэўны аб'ём плошчы, размяшчэння туману ў прасторы. Метафарычна прыродная з'ява, калі ў тумане нічога ці невыразна штосьці бачыцца, прыпадабняецца да ўласцівасці ўспрымання чалавекам, які сапраўды дрэнна бачыць, помніць ці знаходзіцца ў стане задуменнасці, калі акаляючае ён дакладна і рэальна не ўспрымае. Параўнальны фразеалагізаваны зварот *як у тумане* набыў ролю эталона, стэрэатыпа дрэннага бачання ў пэўным выпадку ці ўвогуле слабога зроку чалавека, дрэннай памяці альбо высокай ступені заглыбленасці ў свае думы.

Метафара «туман» вызначаецца і такой семантычнай прыкметай, што ўласціва і прыпісаная чалавекам гэтаму найменню атмасфернай з'явы і такой нададзенай слову *туман* сімволікай, як ‘няпраўда, мана’. І гэта выразна выяўляецца ў фразеалагізмах *пыл / туман у вочы* ‘падман з мэтай стварыць няправільнае ўражанне’ (Л-2008-2: 283) і *пускаць пыл / туман / дым у вочы* ‘выхваляючыся, падманваць каго-н., ствараць падманлівае ўражанне пра сябе’ (Л-2008-2: 278).

Дзеяслоўны фразеалагізм створаны ў выніку пераасэнсавання свабоднага спалучэння слоў, дзе выбар протасітуацыі і ўсіх кампанентаў абумоўлены сувяззю гэтай адзінкі з культурнымі кодамі: антропна-дзейнасным (праз кампанент *пускаць*), прыродным (праз варыянтныя кампаненты *пыл / туман / дым*), а таксама прасторавым і саматычным (праз спалучэнне *ў вочы*). Звернем увагу на выбар кампанента *вочы*, які выступае сімвалам усведамлення, дакладнасці ўспрымання не толькі на аснове метаніміі «вочы – зрок», ці адбываецца

 © В. А. Ляшчынская, 2017.

перанос назвы паводле сумежнасці з бачання на разуменне, але і на аснове метаніміі, калі праз частку называецца цэлае, – «вочы – чалавек». Цікавым фактам выкарыстання фразеалагізма з’яўляецца і наяўнасць варыянтных кампанентаў для наймення сродку дзеяння – *пыл / туман / дым*, якія аб’ядноўваюцца ў сваім вызначэнні як ‘дробныя цвёрдыя часцінкі’, што знаходзяцца ў паветры, і за якімі замацавана агульнае сімвалічнае значэнне – ‘няяснасць, невыразнасць’.

У аснове вобраза фразеалагізма ляжыць антропная метафара, паводле якой адзін чалавек выхваляецца перад другім, прадстаўляе сябе ці стварае пра сябе лепшае ўражанне, чым яно ёсць на самой справе, узвышае сябе ў вачах другой ці другіх асоб, што прыпадабняецца да пускання ім туману ў вочы, які і ёсць тая мана, падман, няпраўда (гл. фразеалагізм *пыл / туман у вочы*). Фразеалагізм *пускаць пыл / туман / дым у вочы* перадае стэрэатыпнае ўяўленне пра жаданне не вельмі сумленных людзей быць больш значнымі, чым яны ёсць, людзей, якія любяць выхваляцца сваімі нерэальнымі заслугамі і пад. А фразеалагізм *пыл / туман у вочы* набыў ролю эталона падману, хвальбы, ці той інфармацыі, якая не адпавядае сапраўднасці і служыць для прыкрыцця, для пафаснасці і нават проста да для ашуканства.

Блізкімі паводле значэння, але з адметнасцю сем і будовы выступаюць наступныя аднаструктурныя фразеалагізмы: *туманіць вочы* ‘знарок уводзіць у зман’ (Л-2008-2: 537); *туманіць вочы / галаву* ‘задурваць, падманваць’ (Ю-1977: 115) і *туманіць галаву* ‘ўводзіць у зман, падманваць каго-н.’ (Л-2008-2: 537). А іх адметнасць ад папярэдніх у наяўнасці вытворнага ад назоўніка *туман* дзеяслоўнага кампанента *туманіць*, які часткова захоўвае сваё зыходнае значэнне – ‘рабіць няясным, незразумелым, блытаць’ [7, с. 40]. Адносна разумення і ўспрымання названых фразеалагізмаў маецца на ўвазе, што адзін чалавек падманвае, ашуквае другога, гаворачы яму няпраўду, што не адпавядае выпрацаваным нормам і правілам узаемаадносін паміж людзьмі. І такое дзеянне чалавека, што, дарэчы, выяўляе яго нядобрыя намеры, зыходзячы са зместу маўлення, прыпадабняецца на аснове метафары гаварэнню няпраўды, маны, хлусні, падачы ілжывай інфармацыі. Кампаненты *галава* і *вочы* на аснове метаніміі праз найменне часткі называюць цэлае – чалавека, а таксама выступаюць найменнямі тых органаў, частак цела чалавека, якія служаць чалавеку для ўспрымання, усведамлення і асэнсавання рэчаіснасці, усяго, што акаляе, ці таго, што ўспрымаецца зрокам, розумам.

© В. А. Ляшчынская, 2017. 

У выніку фразеалагізмы *туманіць вочы*; *туманіць вочы /галаву* і *туманіць галаву* перадаюць стэрэатыпнае ўяўленне пра наўмыснае ашуканства, падман, што падпадае пад асуджэнне і адмоўную ацэнку.

І яшчэ адна адметная семантычная прыкмета, што замацаваная ва ўяўленні чалавека і прыпісаная на аснове метафарычнага ўспрымання туману, – ‘нерэальнае, неадпаведнае сапраўднасці’. Гэта асабліва відавочна ў вобразе фразеалагізма *ружовы туман* ‘стан таталітарна-савецкага ўспрымання рэчаіснасці’ (Л-2008-2: 537), адметнасць якога ў каляровым прадстаўленні туману, які вядомы ў рэальнасці як нешта шэрае, невыразнае, і праз кампанент *ружовы* суадноснасці фразеалагізма з каляровым кодам культуры.

Вядома, што ацэнка, нормы, устаноўкі чалавека ў значнай ступені звязаны з колерам. А колеравыя вобразы, пабудаваныя моўнымі сродкамі, як у нашым выпадку з дапамогай другасных адзінак мовы – фразеалагізмаў, аказваюць уплыў на эмацыянальную сферу чалавека, заснаваную на яго здольнасці выклікаць у сябе адчуванне колеру і асацыяваць з ім тое пачуццё і эмоцыю, якія ён адчувае пры гэтым. Каляровы вобраз фразеалагізма дазваляе эфектыўна кадзіраваць вялікі аб’ём інфармацыі, у тым ліку і эмацыянальнай, без перагрузкі кагнітыўнай сістэмы і перамяшчацца з аднаго свайго патэнцыялу да другога, эканомячы значную частку ментальнай энергіі, што на ўзроўні семантыкі адлюстроўваецца ў прырашчэнні сэнсаў колераабазначэннямі. Так, за ружовым колерам у многіх мовах, у тым ліку і ў беларускай, захоўваецца свая дадатковая да асноўнай – ‘які атрымліваецца ад змешвання чырвонай фарбы з белай (пра колер); светла-чырвоны’ [8, с. 722] – канатацыя – ‘радасны, няясны’, што, несумненна, і паспрыяла адбору і выкарыстанню гэтай лексемы пры ўтварэнні фразеалагізма *ружовы туман.*

Вобраз фразеалагізма пабудаваны на каляровай метафары, паводле якой няяснае, нерэальнае, не такое, як трэба, як павінна быць, але радаснае ўспрыманне савецкай рэчаіснасці з яе плюсамі і мінусамі прыпадабняецца да ружовага туману. Тут туман не столькі мана, ашуканства, колькі не тое, што трэба, што адпавядае рэальнасці, а ў спалучэнні з каляровым азначэннем атрымліваецца ружовая нерэальнасць. Фразеалагізм *ружовы туман* выступае ў ролі эталона светлага, крыху прыфарбаванага ў светлыя колеры, а таму радаснага ўспрымання жыцця савецкага перыяду ўвогуле ці пэўнай сітуацыі ў жыцці чалавека.

 © В. А. Ляшчынская, 2017.

Такім чынам, лінгвакультуралагічны аналіз фразеалагізмаў беларускай мовы з кампанентам *туман* дазваляе канстатаваць, што адбор кампанента-лексемы *туман* і ўключэнне яе пры стварэнні вобразаў другасных адзінак мовы як сэнсава асноўнага ў іх структуры і семантыцы абумоўлены ацэнкай туману як атмасфернай з'явы прыроды, што сімвалізуе няясную, недакладную, расплывістую інфармацыю, прыпадабняецца да падману і ашуканства ў міжасобасных адносінах людзей, негатыўна ацэньваецца паводле ўспрымання і асэнсавання рэчаіснасці.

**Літаратура**

1. Ковшова М. Л. Лингвокультурологический метод во фразеологии. Коды культуры / М. Л. Ковшова. – М. : Книжный дом ЛИБРОКОМ, 2012. – 456 с.

2. Ляшчынская В. А. Канцэпт *«вада»* ў фразеалагічнай карціне свету беларусаў / В. А. Ляшчынская // Беларуская лінгвістыка. Вып. 73. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – С. 14–23.

3. Ляшчынская В. А. Культурная семантика фразеологизмов с компонентом *вода* в белорусском языке / В. А. Ляшчынская // Мова, освіта, культура : інтеграційні тенденції в сучасному світі : матер. XIII міжнародної Інтернет-конференції. – Вінниця : ФОП Корзун Ю., 2015. – С. 202–205.

4. Ляшчынская В. А. Водныя аб'екты ў фразеалагічнай карціне свету беларусаў / В. А. Ляшчынская // Славянские чтения – 2017 : сб. материалов Междунар. науч.-практ. конф. / Отв. ред. Л. В. Климина. – Стерлитамак : Стерлитамакский филиал БашГУ, 2017.– С. 194–198.

5. Ляшчынская В. А. Сімволіка кампанента і культурны складнік семантыкі фразеалагізмаў / В. А. Ляшчынская // Роднае слова. – 2016. – № 4. – С. 26–30.

6. ТСБМ-5-1 – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5-ці т. Т. 1: А-В / [рэд. тома М. П. Лобан]. – Мінск : Гал. рэд. Беларус. сав. энцыклапедыі, 1977. – 608 с.

7. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5-ці т. Т. 3: Л-П / [Рэд. тома П. М. Гапановіч]. – Мінск : Гал. рэд. Беларус. сав. энцыклапедыі, 1979. – 672 с.

8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5-ці т. Т. 4: П-Р / [Рэд. тома Г. Ф. Вештарт, Г. М. Прышчэпчык]. – Мінск : Гал. рэд. Беларус. сав. энцыклапедыі, 1980. – 768 с.

**Спіс крыніц і іх умоўных скарачэнняў**

***Л-2008-1*** – Лепешаў І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў. Т. 1: А-Л. – Мінск, 2008; ***Л-2008-2*** – Лепешаў І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў. Т. 2: М-Я. – Мінск, 2008; ***М-К-1972*** – Мяцельская Е. С., Камароўскі Я. М. Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі. – Мінск, 1972; ***Ю-1972*** – Юрчанка Г. Ф. І коціцца і валіцца (Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны). – Мінск, 1972; ***Ю-1974*** – Юрчанка Г. Ф. І сячэ і паліць (Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны). – Мінск, 1974; ***Ю-1977*** – Юрчанка Г. Ф. Слова за слова (Устойлівыя словазлучэнні ў гаворцы Мсціслаўшчыны). – Мінск, 1977; ***Я-1968*** – Янкоўскі Ф. М. Беларуская фразеалогія: Фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне. – Мінск, 1968.

*Стаття надійшла до редакції 15.09.2017 р.*

© В. А. Ляшчынская, 2017. 